У СТУДЭНЦКІХ ТВОРЧЫХ КАЛЕКТЫВАХ

# ГАНАРОВАЕ ЗВАННЕ—НАРОДНЫ

ТОЕ, аб чым марыць кожны самадзейны творчы калектыў, — называцца народным — стала явай для студэнцкага тэатра «І т. п...» нашага універсітэта. Пасля апошняга з ліку пастаўленых на студэнцкай сцэне спектакляў— «Горад на світанні» па п'есе А. Арбузава—калектыву тэатра прысвоілі ганаровае званне народнага. Да гэтага высокага прызнання сваёй творчай сталасці калектыў на чале з яго рэжысёрам, акцёрам абласнога драматычнага тэатра Аляксеем Міхайлавічам Бычковым ішоў праз пастаянны пошук, яднанне аматараў тэатральнага мастацтва ў сапраўдны творчы калектыў, праз павышэнне ўзроўню выканаўчага майстэрства.

Вядомаму савецкаму рэжысёру Георгію Таўстаногаву належаць словы: «Вельмі важна, каб чалавек пайшоў з тэатра ўсхваляваным. У адваротным выпадку праца акцёра страчвае сэнс». Выказванне гэта — не толькі аб прафесіянальным тэатры, дзе ўсё без выключэння падпарадкавана асноўнай мэце: праз эмацыянальную будову «прабіцца» да сумлення чалавека. Сыграць сваю ролю так, каб глядач не застаўся абыякавым, павінен і кожны самадзейны артыст. І гэтую вялікую адказнасць перад глядзельнай залай, іх суддзёй, добра разумеюць акцёры «І т. п...». Інакш не былі б так прыхільна прыняты гледачамі пастаўленыя на студэнцкай сцэне спектаклі.

Тэмы чалавечай дабраты, адказнасці за свае ўчынкі («Жорсткія гульні» А. Арбузава), выкрыцця адмоўных з'яў тагачаснай і сённяшняй рэчаіснасці («Лазня» У. Маякоўскага, «Да трэціх пеўняў» В. Шукшына), чысціні сумлення ў складаных жыццёвых сітуацыях («Ноч пасля выпуску» В. Тэндракова) не пакінулі нас абыякавымі. Апошняя ж прэм'ера — спектакль «Горад на світанні» — падвяла вынік доўгай і карпатлівай працы самадзейных артыстаў, стала этапнай у гісторыі універсітэцкага тэатра.

Поспех спектаклю — рэпартажу з працягам у двюх частках — як жанрава акрэслена п'еса А. Арбузава, прадвызначыла саса яго тэма. Тэма энтузіязму, запалу, апантанасці камсамольцаў 30-х гадоў, якія разам з горадам сваёй мары будавалі і сябе. Цудадзействам мастацтва, публіцыстычнай рамантыкі п'есы сённяшняя моладзь стала прыналежнай да подзвігу юнакоў і дзяўчат далёкіх трыццатых, якія далі вытокі невычарпальнай энергіі моладзі Краіны Саветаў, праклаўшай шлях ад горада ў глухой тайзе да вяршынь космасу.

Але ж не толькі цікавы рэпертуар прынёс тэатру «І т. п...» прызнанне. Ёсць яшчэ і другі бок справы — састаў акцёраў. Іх у тэатральным калектыве — 30, розных па характару, узросту, магчымасцях. Некаторыя тут ужо «ветэраны», у другіх творчае жыццё толькі пачынаецца. Але якім бы ні быў па працягласці іх творчы шлях, усіх аб'ядноўвае адно — жаданне іграць на сцэне самааддана, натхнёна, творча, каб глядач верыў ім да канца, суперажываў разам з іх героямі.

Ганарова называцца народным калектывам, але і вельмі адказна. Гэта разумеюць рэжысёр тэатра А. М. Бычкоў, самадзейныя акцёры. Пацвярджаць высокае званне яны пастараюцца сваімі новымі цікавымі пастаноўкамі. А мы, гледачы, з нецярплівасцю будзем чакаць, калі ў чарговы раз адкрыецца заслона, выйдуць на універсітэцкую сцэну артысты, і мы ацэнім убачанае гарачымі і працяглымі апладысментамі.

**Т. ДУБЯК.**



*Глядач— аб спектаклі*

# ТЭМА, ЯКАЯ ХВАЛЮЕ

Зварот студэнцкага тэатра «І т. п...» да п'есы А. Арбузава «Горад на світанні» — не выпадковы. У ёй закрануты праблемы, якія не страцілі сваёй актуальнасці і ў нашы дні, хаця час дзеяння далёкі ад нас на пяць дзесяцігоддзяў. Трэба адзначыць, што ўвесь пафас спектакля выражаны ў гераізме тых гадоў, ва ўпэўненасці камсамольцаў у даручаную ім партыяй справу, у той самааддачы, з якой яна выконваецца. Сучаснасць, суаднесенасць з сённяшнім днём адчуваецца не толькі ў распрацоўцы вобразаў асобных прадстаўнікоў камсамола. Гэта не толькі расказ аб энтузіязме і цяжкасцях тых дзён, гэта яшчэ і разважанне над чалавечымі лёсамі, над пытаннямі кіраўніцтва камсамольскімі масамі, над метадамі работы ў калектыве. Нават лірычная тэма або, лепш сказаць, тэма кахання ў спектаклі набывае нейкае катэгарычнае і рэзкае аблічча. Узаемаадносіны паміж Зорыным і Корневай складваюцца вельмі хутка і гэтак жа хутка распадаюцца. І іх выканаўцы (І. Іваноў і Н. Дабравольская) даюць толькі знешні малюнак свайго пачуцця. Наогул, трэба сказаць, что вобразы і сюжэтныя лініі, выведзеныя ў спектаклі, распрацоўваюцца зыходзячы з адной задачы — ярка, без паўтаноў расказаць аб той нялёгкай працы, якую выконвалі камсамольцы ў гады будаўніцтва горада на світанні — Камсамольска-на-Амуры. І толькі адзін вобраз стаіць неяк асобна, хаця і ўносіць патрэбныя фарбы ў агульны ход прадстаўленага дзеяння. Гэта вобраз Альтмана (А. Скрыпкін), адчуваецца штосьці лірычнае і летуценнае ў яго характары. Гэтая летуценнасць, мары героя аб будучым горадзе даюць магчымасць адчуць гледачам усю правамернасць тых спрэчак і той працы, якую ўкладваў кожны.

Увесь ход дзеяння першай часткі п'есы падрыхтоўвае яе кульмінацыйны момант—уцёкаў Зорына, Кротава і Альтмана, і затым, як апошні штрых сюжэтнага развіцця гэтай лініі, гучаць словы Аляксея (І. Іваноў), у якіх адчуваецца і барацьба з самім сабой і ў той жа час нежаданне зразумець тых людзей якім ён здрадзіў. Уся другая частка — гэта зусім іншая праблема. Калі ў першай дзеі спектакля паказана барацьба чалавечых характараў і барацьба пачуццяў, то ў другой — барацьба двух процілеглых пунктаў гледжання на камсамольскае кіраўніцтва, на метады будаўніцтва. Пачуццям і яркім эмоцыям тут удзелена менш месца.

На жаль, не ўсе вобразы ўдаліся ў спектаклі так, як скажам Белавуса (А. Нікалаенка), Альтмана (А. Скрыпкін), Жмялькова (В. Русакоў), Корневай (Н. Дабравольская), Зябліка (І. Башкінцаў) і іншых, у якіх адчувалася асноўная лінія характару, вытрыманая ад пачатку да канца п'есы. Стварaецца ўражанне, што некаторыя з герояў, выведзеныя на сцэну, служаць толькі фонам для ўжо названых вышэй персанажаў Так, напрыклад, учынак Наташы (Т. Праўдзівая) слаба падрыхтаваны. Забойства ёй Алёнушкіна (В. Дубік) выглядае хутчэй выпадковым, чым асэнсаваным дзеяннем. Некаторую павярхоўнасць і схематычнасць трэба адзначыць і ў раскрыцці вобраза Аксаны (Н. Калесніка-ва). На жаль, складвалася ўражанне, што яе вобраз неабходны толькі для падтрымкі асноўнага сюжэтнага хода, а сам па сабе ён не заключае той глыбіні, якая вызначае індывідуальнасць.



Няма неабходнасці гаварыць аб тым, што спасылка на непрафесіяналізм акцёраў не здымае з іх адказнасці за асобныя няўдачы або недапрацоўкі. Трэба пажадаць выканаўцам роляў у апошнім пастаўленым спектаклі і ўсяму калектыву тэатра, каб нават нязначныя эпізоды выглядалі такімі ж пераканаўчымі, як і асноўныя.

Своеасаблівая форма пастаноўкі спектакля. Дзеючыя асобы выходзяць на сцэну непасрэдна з глядзельнай залы, многія рэплікі, што дапамагаюць выявіць унутраны стан герояў, удзельнікі спектакля гавораць таксама з радоў гледачоў. Гэта наладжвае патрэбны кантакт з залай і робіць яе саўдзельніцай адбываючыхся падзей.

Думаецца, што і ў далейшым самадзейныя артысты будуць разам з рэжысёрам тэатра А. М. Бычковым шукаць новыя хвалюючыя тэмы, а значыць у нас, гледачоў, адбудуцца новыя сустрэчы з мастацтвам.

**А. ДЗЕДЗІКАВА,**
**студэнтка гр. Р-22**
**гісторыка-філалагічнага факультэта.**

**НА ЗДЫМКУ:** сцэна са спектакля «Горад на світанні».

Фота В. Ткачэнкі.

*Цвярозасць — норма жыцця*

# СВОЕЧАСОВЫЯ МЕРЫ

Апублікаваныя ў друку дакументы аб мерах па пераадоленню п'янства і алкагалізму служаць справе ўмацавання здароўя савецкага чалавека, маральнага і сацыяльнага самаадчування, інтарэсам усяго грамадства.

Чалавек п'е горкую. Ён наносіць шкоду свайму здароўю, нясе пакуты сям'і і блізкім, перашкаджае нармальна працаваць калектыву наносіць маральныя і матэрыяльныя страты грамадству Рэалізацыя новых мер, прадугледжаных партыяй і ўрадам, наблізіць наша грамадства да цвярозасці як нормы жыцця.

Прадугледжаныя меры строгія, але справядлівыя Яны ўлічваюць думку савецкіх людзей, якія аднадушны ў тым, што злоўжыванне алкаголем трэба выкараніць раз і назаўсёды. У апублікаваных дакументах вызначана ступень адказнасці за знаходжанне на рабоце ў нецвярозым стане і распіццё там спіртнога, за парушэнне правілаў гандлю ім. Асабліва строга ў сувязі з гэтым пастаўлена пытанне аб маральным абліччы кіраўніка, камуніста, камсамольца. За схільнасць да спіртных напіткаў, за наладжванне выпівак на рабочым месцы давядзецца адказваць з ўсёй строгасцю.

Узмацняецца роля і пашыраюцца паўнамоцтвы працоўных калектываў. Ім належыць асаблівая роля ў перавыхаванні аматараў выпіўкі. Тут усё навідавоку: і чалавек, і яго непрыстойныя паводзіны, і страты, якія п'яніца прыносіць астатнім членам калектыву. Тут і павінны сказаць таварышы па рабоце сваё цвёрдае слова: «Хочаш быць з намі, хочаш быць нам таварышам не ганьбі добрае імя работніка»

Весці больш рашучую і непрымірымую барацьбу з аматарамі выпіўкі павінны таварыскія суды, якія ёсць у кожным працоўным калектыве. Не ўпускаць ніводнага выпадку злоўжывання алкаголем ні дома, ні на рабоце, трымаць аматараў «зялёнага змію» у пастаянным полі зроку, каб яны адчулі, што мірыцца з імі ніхто не будзе — вось надзённыя задачы членаў таварыскіх судоў.

Рашучыя меры партыі і дзяржавы па пераадоленню п'янства і алкагалізму, безумоўна, будуць садзейнічаць выпрацоўцы ў кожнага чалавека імкнення да цвярозага спосабу жыцця, і ажыццяўленне гэтых мер — справа ўсіх і кожнага.

**М. ГАПЕЕВА,**
**старшыня таварыскага суда ГДУ.**

# ВЫКАРАНІЦЬ ЗЛО

Савецкія людзі маюць матэрыяльныя і духоўныя магчымасці для ўсё больш поўнага развіцця асобы. Але важна, каб грамадзянін СССР умеў імі разумна карыстацца. Камуністычная партыя бачыць адну з важнейшых задач у мэтанакіраваным фарміраванні разумных патрэб асобы. Але, на жаль, ёсць у нас яшчэ людзі, якія наносяць маральныя і матэрыяльныя страты грамадству — гэта аматары спіртнога, ці проста п'яніцы.

Каб выкараніць гэта сацыяльнае зло, партыя і ўрад прынялі адпаведныя дакументы, якія цяпер горача абмяркоўваюцца савецкімі людзьмі. Не засталіся ў баку ад гэтага і мы, студэнты трэцяга курса гістфіла — будучыя гісторыкі. Мы аднадушна заявілі на сваім сходзе: у сучасных умовах, калі ўсё паўней раскрываюцца вытворчыя сілы сацыялізма, перавага сацыялістычнага ладу жыцця, асаблівае значэнне набывае строгае захаванне прынцыпаў камуністычнай маралі. А гэта гаворыць аб тым, што сярод нас не павінна быць месца п'яніцам і дэбашырам прыхільнікам «узняць настрой» спіртнымі напіткамі.

Мы, студэнты, поўнасцю падтрымліваем пастановы партыі і ўрада, лічым, што аматараў «зялёнага змія» не павінна быць асабліва сярод моладзі, чыё жыццё ў далейшым вызначыць лёс нашай краіны, будзе прыкладам для падрастаючага пакалення.

Барацьбу з п'янствам і алкагалізмам, выхаванне цвярозасці, як залогу моцных духам і целам, камсамольцы нашай групы бачаць у аснове сваёй будучай работы. Гэта тэма стане бягучым летам састаўной часткай дзейнасці нашых лектарскіх груп і агітбрыгад у перыяд трэцяга працоўнага семестра.

«П'янству — бой, няма месца алкагалізму сярод моладзі» — гэтыя словы павінны стаць дэвізам усіх савецкіх студэнтаў.

**І. ЭСМАНТОВІЧ,**
**камсорг гр. Г-31**
**гісторыка-філалагічнага факультэта,**
**адказная за палітыка-выхаваўчы сектар**
**камітэта ЛКСМБ ГДУ.**

